# На тым тыдні...

### *Ратуемся спадчынай*

✓Польскі празаік, сцэнарыст і журналіст, які паходзіў з Глыбоччыны, **Тадэвуш Даленга-Мастовіч (1898 – 1939)** быў самым высокааплатным пісьменнікам міжваеннай Польшчы і запатрабаваным стваральнікам кінасцэнараў, некаторымі з якіх перад Другой сусветнай вайной зацікавіліся ў Галівудзе. Гэтаму творцу была прысвечаная чарговая сустрэча ў рамках цыкла «Санаторый пад клепсідрай», што адбылася **9 сакавіка**. Сярод асноўных тэмаў – ад часопіснай фельетаністыкі да раманаў-бестселераў, беларускія матывы ў творчасці польскага аўтара, прычыны шалёнага поспеху ў чытачоў, грамадска-палітычная сатыра пісьменніка («Кар'ера Нікадэма Дызмы»), «Знахар» у версіях Міхала Вашыньскага і Ежы Гофмана, раманы пісьменніка на старонках часопіса «Полымя».

Удзел бралі перакладчыкі Марыя Пушкіна і Алеся Емяльянава-Шыловіч, галоўны рэдактар часопіса «Полымя» Алена Мальчэўская, літаратар Андрэй Хадановіч.

✓**10 сакавіка** ў Нацыянальным гістарычным музеі Рэспублікі Беларусь прайшло адкрыццё фотавыставы **«Даліна Руж»** секцыі «Аналагавы Фотаздымак» грамадскага аб'яднання фатографаў. Гэта трэцяя па ліку выстава – вынік творчых фотапленэраў, што расцягнуліся на некалькі гадоў.

Ружаны – менавіта так называецца гарадскі пасёлак у Пружанскім раёне, што мае багатую гісторыю і ўнікальную архітэктуру. Ключавой славутасцю з'яўляецца палацавы комплекс Сапегаў – цэнтральная рэзідэнцыя аднаго з найбагацейшых магнацкіх родаў нашай краіны. Тут ёсць таксама царква Святых Пятра і Паўла. Фатографы не маглі пакінуць па-за ўвагай і касцёл Святога Казіміра.

Куратар і ідэйны натхняльнік выставы і секцыі «Аналагавы Фотаздымак» – Уладзімір Суцягін; удзельнікі Вікторыя Розум, Таццяна Заранок, Анастасія Шпакава, Надзея Паўлава, Аленка Данброва, Галіна Ламака, Дзяніс Співак, Сяргей Кулагін, Яўген Гараўскі, Уладзімір Пехцераў, Віталь Ціхаміраў, гісторык Валянцін Калнін, У. Суцягін.

Выстава працуе па 28 сакавіка.

✓**10 сакавіка** ў мастацкай галерэі «Універсітэт культуры» адбылося адкрыццё выставы **«Волшебных сказок голоса»** мастачкі Аляксандры Раманавай. Мастачка нарадзілася ў Віцебску, скончыла Віцебскае вучылішча мастацтваў, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў. Экспазіцыю складаюць 4 серыі графічных працаў, аб'яднаных тэматыкай казачных і міфічных вобразаў. Казачны і рэальны свет у яе працах пераплятаюцца і робяцца адзінай прасторай. Асаблівасцю кожнай працы з'яўляюцца аб'ёмнасць манахромнай выявы, цікавасць да дэталяў, дэкаратыўнасць. Вобраз анёла з'яўляецца ў творчасці мастачкі цэнтральным. Да яго аўтар звярталася неаднаразова як мастак, рэжысёр і драматург.

Пабачыць казачных герояў можна да 24 сакавіка.

✓**З 11 сакавіка** ў Нацыянальным гістарычным музеі Рэспублікі Беларусь працуе персанальная выстава акварэльных і графічных работ Аляксандра Лакоткі **«Вобразы мілыя роднага краю...»**. Праводзіцца ў рамках мерапрыемстваў, прысвечаных Году народнага адзінства.

А. Лакотка – архітэктар, акадэмік НАН Беларусі, доктар гістарычных навук, доктар архітэктуры, прафесар. У сваёй прафесійнай дзейнасці займаецца навуковай працай у галіне тэорыі і гісторыі, аховы і рэстаўрацыі помнікаў архітэктуры. Даследчык агульных і рэгіянальных рысаў беларускага народнага дойлідства. Стварыў навуковую канцэпцыю гістарычнага феномена беларускай архітэктуры як выніку сінтэзу будаўнічага мастацтва Усходу і Захаду Еўропы.

Вывучаючы гісторыка-культурную спадчыну, шмат падарожнічае па Беларусі і выканаў не адну серыю акварэльных і графічных работ краявідаў рэгіёнаў, запаведных мясцінаў, прыгожых відарысаў. Любімыя тэмы мастака – прырода, палі і лугі, лясы і далягляды, тыповыя беларускія вёскі: Залессе і Зарэчча, Забалацце і Балотчыцы, Селішча, Нізок, хутары і мястэчкі (Дзятлава і Рубяжэвічы, Гервяты і Варняны, Солы і Свір), помнікі дойлідства. Пры ўсёй лірычнасці, малюнкі дакументальна дакладныя: гэта летапіс роднай зямлі нашага часу, дар нашчадкам, пасыл у будучыню.

Выстава працуе па 4 красавіка.



*Скарыстаная інфармацыя з паведамленняў Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь, Польскага інстытута ў Мінску, мастацкай галерэі «Універсітэт культуры»*

**Сябры, ідзе падпіска на «Краязнаўчую газету» на 2-і квартал. Будзьма разам!**

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКІ